УДК 159.964.2:821.162.1–1.09«18»

# Сімвалічнае ўвасабленне архетыпа ценю ў паэме А. Міцкевіча “Дзяды”

***Жылко У. А.***
*Установа адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”, Гродна*

*У артыкуле разглядаецца адметнасць увасаблення архетыпа ценю ў паэме А. Міцкевіча “Дзяды”. Абапіраючыся на архетыпічную тэорыю К. Г. Юнга, аўтар адзначае, што выяўленне адметнасці мастацкага ўвасаблення архетыпа ў паэме адбываецца на суб’ектыўным узроўні асобнага персанажа (Густаў-Конрад, душы грэшнікаў), або на калектыўным узроўні супольнасці (вобразнае ўвасабленне ўлады як ворага і дэструктыўнай дзейнасці чужынцаў) – тое, што супрацьстаіць і перашкаджае гарманічнаму развіццю, парушае звыклы парадак і затармажвае дынаміку. Падкрэсліваецца, што на змястоўную афарбоўку ўвасаблення архетыпаў у мастацкіх вобразах, сімвалах, сюжэтах уплывае не толькі сусветны досвед, але і эпоха, сацыякультурны кантэкст, культурная праграма. Архетып ценю адлюстраваны А. Міцкевічам у паэме “Дзяды” ў розных сімвалічных мадыфікацыях, аб’яднаных адмоўнай канатацыяй. Адначасова звяртаецца ўвага на амбівалентнасць архетыпа: прынящце ўласнага ценю, змаганне і пераадоленне калектыўнага ценю садзейнічае развіццю асобы і супольнасці. Гэта даследаванне з'яўляецца ўнёскам у выяўленне архетыпічных аспектаў беларускай культуры XIX стагоддзя.*

***Ключавыя словы:*** *архетыпы культуры, архетып ценю, калектыўнае бессвядомае, дуалізм светабудовы, індывідуальны і калектыўны ўзроўні архетыпа, архетыпічны вобраз, сімвалы, Карл Юнг, Адам Міцкевіч, паэма А. Міцкевіча “Дзяды”.*

*(Искусство и культура. – 2017. – № 2 (26). – С. 60–65)*

# Symbolic Embodiment of the Archetype of Shadow in A. Mickiewicz’s poem «The Dziady»

***Zhylko U. A.***
*Educational Establishment «Grodno State Yanka Kupala University», Grodno*

*The article deals with the embodiments of the archetype of Shadow in A. Mickiewicz’s poem «The Dziady». Using the Jungian archetypal theory it is noted that the detection of particular artistic expression of the archetype of Shadow in the poem takes place on the subjective level of the individual character (Gustav-Konrad, the souls of sinners), or on the level of the collective community (the figurative embodiment of the power as an enemy and the destructive activity of aliens) – all that opposes and prevents the harmonious development, violates the usual order and inhibits the dynamics. The author emphasizes the specific images, which are projected on the archetype of Shadow are due not only to the world's collective experience, but also the era, the social and cultural context, the dominant cultural program. In the context of the cultural understanding of the ambivalence of the archetype of Shadow: the struggle and the acceptance of own Shadow promotes the development of the individual and the society. This study is a contribution to the development of the archetypal aspects of Belarusian culture of the XIX century .*

***Key words:*** *archetype of culture, the archetype of shadow, the collective unconscious, the universe dualism, the individual and the collective level of the archetype, symbols, Carl Jung, Adam Mickiewicz, the poem «The Dziady».*

*(Art and Cultur. – 2017. – № 2 (26). – P. 60–65)*

Усеахопліваючымі сімваламі праяваў калектыўнага бессвядомага і адначасова культурнай субстанцыяй, якая спараджае імпульсы да станаўлення супольнасці на падсвядомым і ментальным узроўнях, з’яўляюцца архетыпы. Архетыпы характарызуюць асноўныя ўласцівасці як асобы, так і грамадства, супольнасці, уплываюць на асаблівасці светаўспрымання, духоўныя арыентацыі і сацыякультурныя дасягненні яе членаў. З аднаго боку, архетыпы абумоўліваюць схільнасць да паводзін пэўнага тыпу, з другога – калектыўныя ідэі, вобразы, якія выяўляюцца ў міфах, казках, мастацтве, выказваюць “дух эпохі” ў сімвалічнай форме. Архетыпы канцэнтруюць у сабе пачуццёвыя, эстэтычныя, культурныя ўяўленні [1, с. 147]. Свядомасці дасяжныя толькі архетыпы, увасобленыя ў сімвалічнай форме.

Сфера бессвядомага, інтуіцыі, ілюзіі адыгрывала вызначальную ролю ў межах светапоглядНага ўзроўня рамантычнай сацыякультурнай парадыгмы, што, безумоўна, знайшло адлюстраванне і ў мастацкай творчасці многіх суб’ектаў культуры. Тое, што ўвасоблена ў ілюзіях, мроях, эмацыйна-пачуццёвай сферы, сферы звышрэальнага, бессвядомага станавілася натхняльным чыннікам, імпульсам у творчасці і жыцці для суб’ектаў рамантычнай сацыякультурнай парадыгмы. Адным з паказальных прыкладаў у гэтым дачыненні выступае паэма А. Міцкевіча “Дзяды”, якая мае ўсе падставы для аналізу з пункту гледжання архетыпалогіі. Асабістае бессвядомае, паводле К. Юнга, адпавядае архетыпа ценю, пад якім варта разумець “негатыўную” частку асобы – “суму схаваных, нявыгадных уласцівасцяў, недастаткова развітых функцый і зместу асабістага бессвядомага [2, с. 72]”.

Мэта дадзенага артыкула – выявіць на матэрыяле паэмы А. Міцкевіча “Дзяды” асаблівасці мастацка-сімвалічнага ўвасаблення архетыпа ценю як аднаго з цэнтральных архетыпаў у сферы бессвядомага. У дачыненні да вызначальнага

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: uliana915@mail.ru – У. А. Жылко*

Репозиторий ВГУ

ў працэсе айчыннага нацыястанаўлення гісторыка-культурнага перыяда XIX ст. выяўленне акрэсленай адметнасці падаецца надзвычай актуальным, паколькі дае магчымасць не толькі раскрыць раней не вывучаныя аспекты культурных тэкстаў, але і дазваляе глыбей зразумець прыхаваныя імпульсы і сімвалы нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

**Архетып у разуменні К. Юнга.** К. Юнг тэарэтычна распрацаваў феномен калектыўнага бессвядомага, што складаецца з архетыпаў – першасных вобразаў, універсальных мадэляў канцэнтрацыі досведу, назапашанага калектыўна ўсімі папярэднімі пакаленнямі [3, с. 190]. Архетыпічная тэорыя ў рамках гуманітарыстыкі была пашырана некаторымі паслядоўнікамі К. Юнга Э. Нойманам, Дж. Хендэрсанам, Дж. Хілманам і іншымі. У айчыннай гуманітарнай навуцы выяўленню архетыпаў у розных культурных тэкстах прысвечаны працы культуролагаў: У. Конана, Л. Кажухоўскай, А. Свечнікавай.

Праведзеныя К. Юнгам даследаванні дазволілі даказаць, што індывідуальная псіхіка з'яўляецца не толькі прадуктам асабістага досведу, але і “валодае даасабістым і трансасабістым вымярэннем, якое выяўляецца ва ўніверсальных патэрнах і вобразах ўсіх сусветных рэлігій і міфалогій [4, с. 10]”.

Архетыпы – першапачатковыя вобразы, найбольш старажытныя і найбольш усеагульныя формы ўяўленняў чалавецтва аб свеце, адлюстраванне паўтаральнага досведу чалавецтва ў сімвалічнай форме. Гэта прыроджаныя псіхічныя структуры, якія ляжаць у аснове агульначалавечай сімволікі сноў, міфаў, казак, іншых аб’ектаў мастацкай фантазіі. Пачынаючы ад першых міфаў да сённяшніх вобразаў масавага мастацтва можна заўважыць няспыннае аднаўленне і бясконцы паўтор гэтых вобразаў. У выніку адбываецца структураванне назапашанага досведу і фарміраванне на яго аснове вобраза культуры, дасяжнага для свядомасці толькі ў сімвалічнай форме.

Вылучэнне архетыпа ценю ў структуры сферы бессвядомага асобы абумоўлена спрадвечным дуалізмам чалавечай сутнасці. Аб дваістасці чалавечай прыроды гаворыцца ў многіх казках і легендах, пра гэта пісалі не толькі псіхолагі, але і філосафы, пісьменнікі і паэты. Дуалізм асобы з’яўляецца паказчыкам складаных узаемадачыненняў асабістага досведу і знешніх выклікаў, імпульсаў рэчаіснасці. Яшчэ старажытнагрэцкі філосаф Платон звярнуў увагу на тое, што чалавечая душа падобная крылатай калясніцы, запрэжанай двума коньмі. Адзін з іх – чорны, выступае ўвасабленнем зла, імкнецца да зямлі, да ніжэйшых памкненняў і інстынктаў, другі – белы, сімвалізуе светлы пачатак, дабро, ён скіраваны да нябёсаў, да свету чысціні і гармоніі. Задача чалавека – навучыцца кіраваць гэтымі двума пачаткамі сваёй душы, падпарадкаваць іх сваёй волі для гарманічнага існавання і развіцця. Дадзеная неабходнасць датычыцца і нацыі як супольнага суб’екта культурнага і гістарычнага развіцця.

Паводле канцэпцыі К. Юнга вылучаюцца два ўзроўні ў даследаванні архетыпа ценю:

– суб’ектыўны, выражаны ў індывідуальным бессвядомым;

– аб’ектыўны, які захоўваецца ў калектыўным бессвядомым. Калектыўны цень сінтэзуецца на аснове негатыўнага агульначалавечага супольнага вопыту. Можна вылучыць цень буйных сацыяльных супольнасцей (абагульнены негатыўны нацыянальны, рэлігійны досвед). Дадзеныя ўзроўні, вылучаныя тэарэтыкам псіхааналізу, абумовілі логіку нашага даследавання паэмы А. Міцкевіча “Дзяды” на прадмет выяўлення архетыпічных сімвалаў ценю.

**Суб’ектыўны ўзровень адлюстравання архетыпа ценю ў паэме А. Міцкевіча “Дзяды”.** Найперш варта звярнуцца да адметнасці ўвасаблення ў паэме “Дзяды” суб’ектыўнага ўзроўня адлюстравання архетыпа ценю. На наш погляд, найбольш яскрава дадзены архетып выяўлены ў адным з цэнтральных вобразаў паэмы – вобразе паэта Густава-Конрада. Спалучэнне двух імёнаў, прадпрынятае аўтарам, наглядна дэманструе прысутнасць у мастацкім вобразе двух бакоў чалавечай асобы. Першы бок – постаць пустэльніка, які хутчэй нагадвае здань, “жывога мерцвяка”, прывіда, у якім увасоблена крайняя ступень адчужанасці чалавека ад рэальнага свету.

Усвядомленая, прынятая за норму аддаленасць ад грамадства для аскетычнага жыцця ў адзіноце ў бязлюдным месцы выступае вызначальнай у вобразе пустэльніка Густава. Пакутуючы ад няспраўджаных надзей на ўзаемнае каханне, страчаны для свету, для людзей і для сябе Густаў літаральна пераўтвараецца ў здань: *О не, нябожчык толькі я для сьвету! / Пустэльнік я! Мяне вы зразумейце! [4, с. 73]; Жахліва, дзеці, бо тут перад вамі / Стаіць мярцьвяк з адкрытымі вачамі* [4, с. 111]. Самотны Густаў адмаўляецца ад усяго, што было значным і дарагім раней, у часы маладосці, калі жывымі былі надзеі на лепшае: “сябры, навука, слава і Айчына!” [4, с. 111] страчваюць значнасць для яго. Па сутнасці, юнак сам пасля ўсвядомленай адмовы, уцёкаў, “смерці для свету жывых” пераўвасабляецца ў цень сваёй каханай Марылі і абяцае быць ёй да канца, калі іх душы сустрэнуцца. Адмаўленне ад жыцця ў рэальнасці, жыццё катэгорыямі мінулага ў краіне успамінаў, уцёкі ад рэчаіснасці ў свет мроі – вось той складнік індывідуальнага бессвядомага, які замінае далей развівацца асобе, перакрывае магчымасці стваральнай дзейнасці.

Аскетызм і адчужанасць як вызначальныя рысы асобы маюць пэўныя асацыяцыі з архетыпам пустыні, якая згадваецца ў аналітычнай псіхалогіі паслядоўнікаў юнгіанства: “Класічным сімвалам адчужэння з’яўляецца вобраз пустыні. Характэрна, што менавіта ў пустыні сустракаюцца праявы Бога [5, с. 53]”. А ў самым адчайным становішчы чалавеку можа дапамагчы толькі Бог, або, паводле К. Юнга, самасць як архетып, як першавобраз цэласнасці. Менавіта ў пустыні як сістэме крайняй адчужанасці адбываецца сустрэча чалавека з самасцю (гэта значыць усведамленне і прыняцце сапраўднага адзінства сваёй асобы).

Дух словамі А. Міцкевіча прамаўляе спрадвечную ісціну пра дуалізм свету і душы: *О, чалавек, каб ведаў ты сваю ўладу! / У міг, як толькі твая думка мільгане, ... Пральецца цёплы дождж, зямлю гром скалане, ... / Шатаны ўжо яе пільнуюць і... анёлы: / Хісьнеш ёй пекла ці ёй неба азарыцца. < ... > О, людзі! Кожны з вас, самотны і замкнёны, / Мог вераю і думкай зруйнаваць бы троны* [6, с. 29]. Для ўласнага адраджэння і пераадолення ў

Репозиторий ВГУ

сабе ценю неабходна “вера і думка” – па сутнасці, менавіта яны выступаюць умовай перайначвання крызісу як асобы, так і супольнасці – сілай, здольнай перамагчы тыранію і гвалт любога дэспатычнага рэжыму. Ксёндз Пётр таксама спрычыніўся да выяўлення самасці (існай сутнасці асобы паэта), прысутнасці Бога ў душы, якая заблукала ў цемры мрояў, спрабуе ўказаць на сапраўднае прызначэнне Густава і ацвярэзіць яго для канструктыўнай, стваральнай дзейнасці, звярнуць увагу на замінаючы бок асобы з мэтай пераадолення яго ў сабе: *І перад сьветам і перад сабою, чуеш, / Ты больш, чым перад Панам Богам, грэшны, / Бо чалавек ня дзеля сьлёз ці жартаў сьмешных / Народжаны, а каб тварыць дабро ўсім людзям!* [4, с. 115]. Маючы паэтычную душу, усвядоміўшы сваё прызначэнне як месіі-выратавальніка народа па сродках паэтычнага слова, пустэльнік Густаў у выніку перараджаецца ў паэта Конрада, у вобразе каторага таксама персаніфікаваны праявы архетыпа ценю. Самотнасць, адчужанасць паэта Конрада ад свету людзей падкрэслівае той факт, што толькі Бог і прырода ў стане зразумець яго: *Ты, Божа, ты Прырода! Абвастрэце слых, / Вас годная мэлёдыя песьняў маіх. / Я майстар! < … > Кручу я зоры сілай духу. / <…>Прыроды, Бога варты сьпеў мой зорны! / Ён твор мой, ён сам жыцьцятворны* [6, с. 81].

Адметнасцю злучэння з уласнай самасцю (паэтам) выступае праява ценю – імкненне стаць на роўных з Богам, выклік абсалютнай уладзе Усявышняга: *Я прагну ўлады – дай, адкрый шлях да яе! <…> / Хачу я ўладу мець, якую сам Ты маеш, / Хачу я душамі ўладаць, як Ты ўладаеш* [6, с. 91]. Неабходны працэс аддзялення “Я” ад ценю павінен завяршыцца прыняццем ценю, для таго каб асоба магла развівацца далей. Рэфлексіўныя імкненні Конрада выступаюць праявай тых дрымотных псіхічных сілаў, якія валодаюць вялікай дынамікай і здольныя прывесці асобу ў выніку альбо да росту, альбо да катастрофы. Паводле К. Юнга, сцэнар залежыць “ад падрыхтаванасці і ўстановак свядомасці”. Выяўлены ў асобе паэта Конрада архетып ценю выступае неабходным крокам у развіцці асабістай гісторыі, яго пераадоленне адкрывае доступ да энергіі калектыўнага бессвядомага. Сам гэты працэс праходзіць у адпаведнасці з дыялектычнай трыядай: тэзіс (праявы архетыпа эга/персоны) – антытэзіс (праявы архетыпа ценю, выключаныя з эга/персоны) – сінтэз (здабыццё новага, прагрэсіўнага ўзроўню ўзаемадзеяння свядомасці-бессвядомага).

У паэме А. Міцкевіча бачыцца варыянт “барацьбы з ценем”, прадстаўленай у антрапаморфным абліччы. Часта гэты антрапаморфны праціўнік валодае ўсімі якасцямі характару героя, але з “процілеглым знакам”, яго воля звярнула тыя ж самыя задаткі не ў сферу дабра, а ў сферу разбуральнага, дэструктыўнага. Гэтага часта небяспечнага двайніка можа перамагчы толькі сам герой – толькі ён у стане пераадолець цёмны бок сваёй жа асобы. У асабістай гісторыі – здабыццё чалавекам месца ў соцыуме, прызнанне і пераадоленне разбуральных імпульсаў у сабе, здабыццё самакантролю і адказнасці перад сабой і грамадствам. К. Юнг разглядае цень як крыніцу жыццёвай сілы, творчага пачатку ў жыцці чалавека. На думку К. Юнга, чалавек, убачыўшы свой цень, лепш усведамляе і светлы бок сваёй асобы. Знаходзячыся паміж гэтымі дзвюма супрацьлегласцямі, успрымаючы адначасова свой цень і сваё святло, асоба непазбежна адчувае і ўласную самасць, цэласнасць.

Момант стваральнай дзейнасці Конрада, моц яго паэтычнага слова ў паэме А. Міцкевіча выступаюць імпульсам да выяўлення ў сабе імкнення да роўнасці з Богам-дэміургам. Нясціплае самаўзвялічванне і папрокі ў бок Творцы за кару “няшчасных палякаў” падкрэсліваюць адмоўную арактарыстыку асобы паводле хрысціянскай дактрыны. Дэманы, цешачыся раздорам з Богам, чакаюць канчатковага грахоўнага падзення героя для таго, каб назаўсёды авалодаць яго душой. Д'ябал выступае варыянтам архетыпа ценю, г. зн. небяспечнага аспекту непрызнанай, цёмнай паловы чалавека [2, с. 101].

Аднак ксёндз выратоўвае паэта, выганяе з Конрада злога духа. Анёлы просяць Усявышняга даравацъ паэту: не шанаваў ён Госпада, але любіў свой народ і пакутаваў за яго. І Бог яму даруе гонар і выклік. Дадзены драматычны момант паэмы акурат апісвае не што іншае, як выяўленне і прыняцце ў сабе ценю – прыхаванай сутнасці, бунтуючага паэта, уладара над сэрцамі людскімі, роўнага Богу-Творцы. Дараванне ад Бога атрымана таму, што ў гэтым нясціплым самаўзвялічванні чытаецца не выключна эгаістычны матыў імкнення валодаць светам і людзьм – імпульс яго накіраваны на абуджэнне змагарных матываў і выратаванне знявечанага пад чужой уладай свайго народу: *Калі дасі мне ўладу, роўную Тваёй, / Я свой народ ствару, як песьню трапяткую, / І больш вялікае, чым Ты зраблю я дзіва – / Бо песьня будзе назаўжды шчасьлівай!* [6, с. 89]. Відавочным з’яўляецца прызнанне ў сабе сілы, роўнай боскай, усведамленне цэласнасці сваёй асобы і яе значнасці ў жыцці народа, сваёй самасці. Трэба ўлічваць тую заўвагу К. Юнга, што ценявая частка асобы – не выключна штосьці адмоўнае, яна толькі ўспрымаецца “Я”-свядомасцю як адмоўнае, так як змяшчае ўсе тыя рысы, якія былі выцесненыя са свядомасці. У выпадку з вобразам Конрада, яго самаўзвялічванне ўспрымаецца не як грахоўны замах на Божую ўладу (*Гэй, зьбірайся на помсту ў дарогу, / Пойдзем з Богам альбо супраць Бога!* [6, с. 73]), а як імкненне выратаваць і вызваліць уласны народ ад д’ябльскай улады імперыі. Паэт хоча “наставіць і праславіць народ” – дадзеная матывацыя не індывідуальная, а хутчэй самаахвярная. І пустэльнік-самотнік Густаў перараджаецца ў паэта-змагара, вязня царскага рэжыму, за жыццё якога паплечнікі (Жыгота, Зан і іншыя гістарычна дакладныя персанажы ў паэме) гатовы ахвяраваць сабой, усведамляючы яго небеспадстаўную значнасць у справе змагання з ворагам у няпросты для народа час.

К. Юнг падкрэслівае важнасць фарміравання архетыпа ценю: “Кожнаму асобнаму чалавеку неабходныя пераварот, унутранае раздваенне, разлажэнне ўстойліва існуючага і абнаўленне <...> [2, с. 11]”. У выпадку з героем паэмы Густавам-Конрадам раздваенне і пераадоленне выступаюць відавочнымі на працягу сюжэта. Праз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

невыноснасць уласных пакутаў Густаў-Конрад павінен зрабіць выбар: альбо загінуць, знікнуць са свету, пераўтварыцца ў здань, альбо пачаць складаны шлях свайго духоўнага перараджэння і развіцця. І першым крокам на гэтым шляху з'яўляецца прымірэнне паэта са сваім ценем, гэта значыць пашырэнне яго свядомасці, якое абмежавана ўласнай самотнасцю і самаўзвялічваннем. Чарговым крокам выступае стаічнае прыняцце пакутаў, самаахвярнасць у імя ідэі выратавання народа: Конрад і паплечнікі па барацьбе становяцца вязнямі-ахвярамі. Такім чынам, у дадзеным вобразе аўтар спыніў увагу на такім актуальным для змагарнай эпохі канцэпце "мастак і ўлада", заснаваным на спрадвечным супрацьстаянні сілы творчасці і прыгнёту імперыі.

А. Міцкевіч у сваёй паэме праілюстраваў адзін з магчымых шляхоў пераадолення індывідуальнага архетыпа ценю: атрымаць энергію ценю, максімальна выкарыстоўваць разбуральныя энергіі бессвядомага, пераўтвараючы іх у пазітыўныя, дапамагае менавіта творчасць, паколькі таямніца творчасці непарыўна знітаваных са свабодай, дабром, павагай і даверам да навакольнага свету і людзей – неад'емнымі якасцямі духоўнасці ў асобным чалавеку і ў грамадстве ў цэлым.

**Увасабленне архетыпа ценю ў вобразах душаў грэшнікаў у паэме "Дзяды".** Аб прыродзе канфлікту розных бакоў асобы К. Юнг пісаў наступнае: "Як толькі чалавек ўсведамляе, што ў яго <...> ёсць цень, што яго вораг у яго ўласным сэрцы, пачынаецца канфлікт, і адзін становіцца двума [2, с. 52]". Дадзены канфлікт у паэме А. Міцкевіча змушае душы грэшнікаў вяртацца на зямлю для пакаяння – прызнання ўласнага ценю як негатыўнага боку асобы, адмоўнага фактара пры жыцці. К. Юнг лічыць, што асоба ніколі не можа "пераскочыць" праз уласны цень або "падмануць" яго. Насупраць, прызнанне ценю неабходна для ўсведамлення сваёй недасканаласці, каб усталяваць зносіны з іншымі людзьмі, разумець узаемасувязь з імі, мець патрэбу ў іх дапамозе і падтрымцы.

У паэме "Дзяды" сімвалічнае ўвасабленне архетыпа ценю ў грахах душаў памерлых, праз прыняцце асабістага бессвядомага арыентаваны не на пераадоленне псіхалагічнага крызісу, а на прымірэнне са сваім ценем з мэтай вызвалення ад яго дамінуючай улады над асобай (душой) пасля таго, як яна пакінула гэты свет. Дадзенае аднаўленне адбываецца на ўзроўні іншай рэальнасці другога вымярэння, якое, аднак, мае сувязь з наяўным часам і прасторай праз містычны абрад Дзядоў – пакліканне душаў у свет жывых для дапамогі і пераходу ў іншы стан (пекла або рай, дараванне вечнага супакою або вечных пакут).

Ступені граху (у А. Міцкевіча – ступені парадку духаў: духі першага, другога, трэцяга парадку. – *У. Ж.*) вызначаюць якасныя ўвасабленні характарыстык архетыпа ценю як часткі сферы бессвядомага ў асобе або супольнасці. Успрымаючы душу як асобу, выяўленыя ў ёй грахі выступаюць выражэннем архетыпа ценю як часткі індывідуальнага бессвядомага, пераасэнсаванага і ўсвядомленага пасля смерці чалавека, і таму не прынятага ў час.

Калі ў чалавека "завышаныя ідэалы" і ён бачыць сябе больш дасканалым, чым астатнія, то тым самым ён міжволі прыніжае іншых ці ставіць іх у падпарадкаванае, рабскае становішча. Дадзены момант у А. Міцкевіча падкрэслены праз вобразнае ўвасабленне канцэпта "жорсткага пана", адлюстраванага ў адной з грэшных душаў. Пан пры жыцці праз свой высокі сацыяльны статус надзяляе сябе ўяўнай уладай над жыццямі людзей, здзекуецца, зневажае, прыніжае і забівае прыгонных, пераступаючы мяжу дазволенага, адлюстроўваючы ва ўласнай асобе жывёльныя разбуральныя інстынкты. К. Юнг падкрэслівае жывёльны, інстынктыўны пачатак, які ўласцівы архетыпу ценю, наступным чынам: "<...> цела гэта – жывёла, якая мае жывёльную душу, гэта значыць, жывая сістэма, падуладная інстынкту. Злучыцца з гэтым ценем – значыць сказаць «так» інстынкту, тым самым таксама сказаць «так» той жахлівай дынаміцы, якая пагражае з-за кулісаў [2, с. 35]". Інстынктыўны бок жорсткасці пана – прыроджаны інстынкт разбурэння, які хаваецца ў сферы бессвядомага асобы. Выкрыты цёмны бок душы пана-тырана "ўва ўладзе духа злога" заканамерна суправаджаецца дэманічнымі істотамі.

У вобразе грэшнай душы пана бачыцца сацыяльна абумоўленая характарыстыка, што выступае праявай калектыўнага ўвасаблення архетыпа ценю ў вобразе ворага. Душа пана ў паэме А. Міцкевіча выступае засяроджваннем крываЖэрнага боку асобы-тырана, несправядлівага ўладара, доказам чаго з'яўляюцца прыжыццёвыя схільнасці пана-ката: пакараць да смерці розгамі свайго прыгоннага за сарваны ў садзе яблык, выкінуць замярзаць галодную жанчыну з малым дзіцём. Прызнанне ў сабе жорсткасці і несправядлівасці праз шчырае пакаянне перад жывымі і мёртвымі, прызнаць і прыняць свой цень пасля смерці, паводле хрысціянскай дактрыны, дазваляе прыняць заслужанае пакаранне і тым самым вызваліцца: *Справядлівы Твой прысуд, о, Божа! / Хто ня быў ні разу чалавекам, / Чалавек таму не дапаможа* [4, с. 35].

Сярод момантаў мастацкага пераасэнсавання архетыпічных вобразаў ценю ў "Дзядах" выступаюць такія якасці індывідуальнага бессвядомага, як жорсткасць у дачыненні да бліжняга, няўважлівасць, хцівасць, неўсвядомленая бесклапотнасць, легкадумнасць, поўная летуценная адарванасць ад рэальнасці, гульня з чужымі пачуццямі. Дадзеныя рысы выступаюць разбуральнымі для чалавечай асобы (душы) з пункту гледжання хрысціянскай парадыгмы маральнасці, паколькі супярэчаць ёй у сваёй сутнасці. Некаторыя з пералічаных характарыстак ценю персаніфікаваны ў вобразе душы летуценніцы-Зосі, якая сустракаецца са сваім ценем ужо пасля смерці: *Слухайце, зважайце ў сябе лепей, / Так, паводле Божага наказу, / Не крануўся хто зямлі ні разу, / Той наўрад ці можа быць на небе* [4, с. 57].

Пра тое, што любоў да бліжняга магчымая толькі пры любові да сябе, гэта значыць, пры прыняцці асобай усяго, у тым ліку, уласнага ценю, кажа К. Юнг: "Але калі людзі будуць выхаваны так, каб выразна бачыць ценявы бок сваёй прыроды, то можна спадзявацца, што яны на гэтым шляху



Рэпазіторый ВДУ

навучацца таксама лепш разумець і любіць сваіх блізкіх [2, с. 31]". Менавіта з гэтым у А. Міцкевіча звязаны матыў даравання граху душам-пакутнікам: душам пестуноў-дзяцей, летуценніцы-Зосі, душам закатаваных сялянаў-цярпліўцаў – прызнанне недасканаласці, пакаянне ў злачынствах ёсць падставай для даравання.

К. Юнг у сваёй канцэпцыі звяртае ўвагу, што архетып ценю можа з'яўляцца перад свядомасцю ў розных відах: антрапаморфным або зааморфным, мужчынскім або жаночым, адзінкавым ці множным. У паэме А. Міцкевіча "Дзяды" акрамя разгледжанага адзінкавага (суб'ектыўнага) ўзроўня сустракаем і калектыўны (аб'ектыўны) узровень увасаблення разглядаемага архетыпа ў сімвалічнай форме архетыпічных вобразаў.

**Калектыўны ўзровень увасаблення архетыпа ценю ў паэме А. Міцкевіча.** Індывідуальны цень складаецца з выцесненых ў бессвядомае перажыванняў асобнага індывіда, калектыўны цень можа прымаць форму "вобразу ворага" – вялікіх сацыяльных груп ці народаў. Калектыўны цень, як правіла, утрымлівае два сэнсавыя кампаненты: нянавісць і адчужэнне. Нянавісць выяўляецца ў прызнанні правамернасці, апраўданасці гвалту ў адносінах да пэўных сацыяльных груп (па нацыянальнай, рэлігійнай, эканамічнай прыкметах). Яна распаўсюджваецца на тых, хто прызнаецца сацыяльна небяспечным, актыўна-супярэчным генеральнай лініі развіцця супольнасці (напрыклад, акупанты-прыгнятальнікі). Калектыўны цень можа праецыравацца на тыя сацыяльныя групы, якія перашкаджаюць, замінаюць развіццю сацыяльнай супольнасці ў канкрэтны гістарычны перыяд.

Дадзены ўзровень базіруецца на негатыўным досведзе супольнасці, абумоўленым тагачаснымі гістарычнымі абставінамі. Улада імперыі выкарыстоўвала кантроль як вядучую форму прыгнёту: кантроль ідэй, абмежаванне самастойнага культурнага развіцця, цэнзура інфармацыі, цэнзура любога віду самавыяўлення асобы і супольнасці (скасаванне статута, русіфікацыя, забарона ўніяцтва). Гэтыя чыннікі безумоўна парушаюць звыклы парадак існавання, уяўляюцца небяспекай гарманічнаму існаванню супольнасці, а значыць патрабуюць пераадольвання шляхам супраціву, змагання.

Сімвалічным увасабленнем усюдыіснага зла, архетыпа ценю калектыўнага (супольнага) узроўня ў паэме А. Міцкевіча "Дзяды" выступаюць розныя мадыфікацыі вобраза ворага. Уласцівасці ценю праецыруюцца на ўладу прыгнятальнікаў, якія ўвасабляюць тагачасную дэструктыўную для супольнасці, варожую да ўсяго нацыянальнага царскую ўладу. Вербалізацыя ідэі змагання з несправядлівасцю выступае ў якасці матывацыі да актыўных дзеянняў, да змагання і самаахвярнасці ў выпадку паразы: *Глядзі, жаўнер маскальскі зь дзідаю падскочыў, / І вастрыё кроў нашага народа смокча, – / Што ж ты зрабіў, найгоршы з катаў, сам прапашчы, / Адзін паправісься ты, Бог табе прабачыць?!* [6, с. 147].

Негатывізм у дачыненні да імперыі-агрэсара падкрэсліваецца паэтам праз акцэнт на разбуральнай, спусташальнай, выключна прысвойваючай дзейнасці народа ў гісторыі: *Але вір патопу прайшоў праз раўніну, / Зусім не пакінуўшы рыцьвін струменяў, / І орды плямён, што пайшлі з той айчыны, / Зусім не пакінулі сьледу агменяў* [6, с. 295]. *Колькі прыдумалі гвалту і ўціску, / Колькіх нявінных сагналі, забілі, / Земляў спустошылі колькі, зглумілі. / Кроўю ліцьвіна, сьлязой украінкі, / Скарбамі Польшчы — сплацілі дарэшты* [6, с. 307].

Увасабленне архетыпа ценю назіраецца ў А. Міцкевіча ў вобразах т. зв. здраднікаў, панскіх прыслужнікаў – іх інтэрпрэтацыя ў мастацкай творчасці суправаджалася продажам душы д'яблу – варожы бок выяўленага калектыўнага ценю падкрэсліваецца сувяззю з цёмнымі дэманічнымі сіламі: *Але хто бачыў Петэрсбург – адчуе, / Яго паставілі, хіба, шатаны* [6, с. 315]. Дэманічнае ўвасабленне ворага падкрэсліваецца характэрным суправаджэннем прыслужнікаў д'ябла. Так тлумачыць небяспеку цара для народа Юзаф: *А цар нам – зьлейшы, –будучыні пагражае, / Ён і зярняты для пасеву зьніштажае, / Шатан яму сваю мэтоду зла тлумачыць* [6, с. 57].

Як бачна, калектыўны ўзровень архетыпа ценю ў паэме А. Міцкевіча прадстаўлены тымі сацыяльнымі групамі, якія перашкаджаюць, замінаюць развіццю сацыяльнай супольнасці ў канкрэтны гістарычны перыяд. Як вядома, сумныя падзеі канца XVIII ст., адзначаныя крахам адной з уплывовых дзяржаваў, былі звязаны з гвалтоўным падзелам тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Негатыўны гістарычны досвед не прамінуў згадаць А. Міцкевіч у сваёй паэме (паколькі сам паэт браў актыўны ўдзел у змаганні) праз яскравую характарыстыку супольных удзельнікаў і ініцыятараў тых драматычных падзей, у чым бачыцца нам сімвалічнае ўвасабленне архетыпа ценю ў мадыфікацыі вобраза ворага: *І смага точыць; воцат аўстрыяк падносіць, / Прусак напоіць жоўцю... Воля сьлёзы росіць* [6, с. 145].

Сам А. Міцкевіч у прадмове да паэмы спыняе ўвагу чытачоў на містычнасці, звышрэальнасці тагачасных падзей: *Усе пісьменьнікі, якія ўзгадваюць перасьлед на Літве, згаджаюцца, што ў справе віленскіх вучняў было штосьці містычнае і таямнічае. Містычны, лагодны, але непахісны характар Томаша Зана, кіраўніка гэтай моладзі, рэлігійнае самаадрачэньне, братэрская згода і любоў маладых вязьняў, кара Божая, што спасьцігае іх прыгнятальнікаў, пакінулі глыбокія ўражаньні ў сьвядомасьці тых, хто быў сьведкаю альбо ўдзельнікам падзеяў; а іх апісаньні быццам пераносяць чытачоў у далёкія часы – часы веры і цудаў* [6, с. 15]. У гэтым бачыцца яскравы момант умяшальніцтва архетыпаў у рэальнасць, у жыццё грамадства, які апісваў у свой час К. Юнг, тлумачыўшы сацыяльна-палітычны крызіс еўрапейскіх краін. Заканамернасць кары Божай для прыгнятальнікаў народа, якія выступаюць праявай архетыпа ценю ў калектыўнай форме ворага ў А. Міцкевіча, падкрэслівае перавагу стваральнага над дэструктыўным у развіцці супольнасці, усведамленне неабходнасці барацьбы на ўзроўні еднасці.

**Заключэнне.** Такім чынам, на змястоўную афарбоўку ўвасаблення архетыпаў у мастацкіх вобразах, сімвалах, сюжэтах уплывае сацыякультурны кантэкст: канкрэтныя вобразы, у якія праектуюцца архетыпы, заўсёды абумоўлены не толькі сусветным

Рэпазіторый БДУ

калектыўным досведам, але і эпохай, якая спараджае іх. Архетып ценю (схаванай адмоўнай сутнасці ў чалавеку або супольнасці) ўвасоблены А. Міцкевічам у паэме "Дзяды" ў розных сімвалічных мадыфікацыях, аб'яднаных адмоўнай канатацыяй: цень уяўляе сабой тое, што замінае гарманічнаму развіццю, парушае звыклы парадак рэчаў, тое, супраць чаго змагаецца герой. Выяўленне адметнасці сімвалічнага ўвасаблення архетыпа ў паэме адбываецца на суб'ектыўным узроўні асобнага персанажа, або на калектыўным узроўні супольнасці. Энергія архетыпа ценю не бывае нейтральнай, і калі яна не сублімiруецца ў творчасці, то выбухае разбурэннем. Цэласнасць асобы паэта Густава-Конрада ў пераадоленні архетыпа ценю ўзыходзіць да самасці – станаўлення асобы паэта-абуджальніка, змагара і пакутніка за свой народ. Дэманічная энергія (бунт супраць Бога, імкненне зраўняцца з ім) выступае праяўленнямі першапачатковай дваістасці ўсёй светабудовы: інтэграваныя з творчым пачаткам, яны могуць быць звернутыя да дабра.

У паэме А. Міцкевіча прызнанне і прыняцце персанажамі ўласнага ценю адбываецца таксама і ў перыяд іх пазачасавага і пазапрасторавага існавання – душы нябожчыкаў прыходзяць на пакаянне, прызнаюцца ў грахах жывым. Паказальнае прызнанне агрэсіўных, антысацыяльных момантаў жыцця пасля смерці праз традыцыйны абрад Дзядоў – пераадоленне часавай і прасторавай мяжы ў прызнанні ўласнага ценю па вертыкалі "рэальнае-ірэальнае", і гэта адпавядае светапоглядам у межах рамантычнай сацыякультурнай парадыгмы.

Уласцівасці ценю ў паэме выразна праектуюцца на ўладу як асноўнага ворага, увасобленага ў разнастайных гістарычна-дакладных і сацыяльна абумоўленых вобразах (цар, суддзі, губернатары, афіцэры, жандармы, паны), а таксама вобразамі чужынцаў (А. Міцкевіч мае на ўвазе іншы этнас: "маскалі", "прусак", "аўстрыяк"). Такім чынам, архетып ценю можа выступаць не толькі ў індывідуальнай, але і прымаць калектыўную форму. Калектыўная форма належыць да ліку фігур калектыўнага бессвядомага і сімвалізуе "іншы бок" пануючага духу часу, яго ўтоеную антытэзу – тое, што супрацьстаіць і перашкаджае гарманічнаму развіццю, парушае звыклы парадак і затармозвае дынаміку.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Юнг, К. Г. Проблемы души нашего времени / К. Г. Юнг. – СПб.: Питер, 2002. – 352 с.
2. Юнг, К. Г. Психология бессознательного / К. Г. Юнг. – М.: Канон +, 2003. – 400 с.
3. Юнг, К. Г. Архетип и символ / К. Г. Юнг. – М.: Renaissans, 1993. – 286 с.
4. Міцкевіч, А. Дзяды: у 2 т. / А. Міцкевіч; пер. С. Мінскевіч. – Мінск: Медысонт, 1999. – Т. 1. – 264 с.
5. Эдингер, Э. Ф. Эго и архетип / Э. Ф. Эдингер. – М.: Пента-График, 2000. – 264 с.
6. Міцкевіч, А. Дзяды: у 2 т. / А. Міцкевіч; пер. С. Мінскевіч. – Мінск: Медысонт, 1999. – Т. 2. – 470 с.

*Паступіў у рэдакцыю 15.12.2016 г.*

Репозиторий ВГУ